Герасимёнок В.Д., студент 350 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Герасимёнок Д.В.,
кандидат культурологии

# АКТУАЛІЗАЦЫЯ ПАДЗЕЙ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ СРОДКАМІ ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

У гады Першай сусветнай вайны тэрыторыя сучаснай Беларусі стала месцам супрацьстаяння двух імперый, якое працягвалася з 1915 па 1918 гг. Гэтыя абставіны істотна паўплывалі на колькасць аб’ектаў, звязаных з ваеннымі падзеямі, якія маглі б стаць грунтоўнай асновай для развіцця ваенна-гістарычнага турызму ў краіне. Аднак савецкая ўлада лічыла Першую сусветную вайну імперыялістычнай і бачыла ў ей негатыўны кантэкст для пабудовы новаўтворанай краіны. Баявыя дзеянні разглядаемага перыяду вывучаліся фрагментарна, пераважна ў межах гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі, мэтанакіраваная праца па добраўпарадкаванню воінскіх пахаванняў практычна не праводзілася. У выніку, пад уплывам часу аб’екты, звязаныя з падзеямі Першай сусветнай вайны, пачалі самастойна разбурацца.

Пасля атрымання незалежнасці ў Беларусі распачаліся маштабныя работы па захаванню аб’ектаў ваеннай гісторыі, рэканструкцыі баявых дзеянняў, распрацоўцы тэматычных турыстычных маршрутаў. Упершыню актыўны ўдзел ў гэтым працэсе прынялі як мясцовыя органы ўлады, так і замежныя прадстаўніцтвы [5, с. 245–246]. Напрыклад, у 2015 г. пры падтрымцы нямецкага грамадскага аб’яднання “Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.” створаны экскурсійны маршрут па Івацэвіцкаму і Пінскаму раенах Брэсцкай вобласці, які прадугледжвае наведванне больш пяцідзесяці аб’ектаў align рознай ступені вядомасці: ад школьнага музея ў в. Выганашчы да рэшткаў абарончых збудаванняў [2, с. 3].

Найбольш актыўныя дзеянні па адраджэнню культурнай спадчыны Першай сусветнай вайны былі прымеркаваны да 100-годдзя з пачатку

ўзброенага канфлікту. Па замове Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь распрацаваны экскурсійныя праграмы “Першая сусветная вайна на Палессі” і “Пад крыжам Святога Георгія: па слядах Першай сусветнай” [5, с. 246]. Маршрут апошняй складае 350 км. (г. Мінск – в. Міхневічы – в. Белая – в. Наваспаск – г. Смаргонь – в. Вайнідзеняты – в. Данюшава – в. Абрамаўшчына – в. Заброддзе – г. Мінск), а працяг – 12 гадзін, што робіць яе адной з буйнейшых у Беларусі. Падчас правядзення праграмы прадугледжаны конныя і веласіпедныя прагулкі да нямецкіх бліндажоў і акопаў [4].

Шэраг турыстычных маршрутаў сумяшчае ў сабе агляд аб’ектаў Першай і Другой сусветнай вайны, як напрыклад, “Мы супраць вайны: вайна ў Нарачанскім краі”, распрацаваны турыстычным прадпрыемствам “Зялёная каманда”. Тураператар “Віяполь” прапаноўвае экскурсію “Сцежкамі Першай сусветнай” (аг. Крэва – в. Наваспаск – г. Смаргонь – аг. Солы – в. Заброддзе), якая ўключае захаваўшыяся да нашага часу аб’екты ваеннай гісторыі на тэрыторыі Гродзенскай і Мінскай абласцей. У межах неваенных маршрутаў згадваюцца Крэўскі замак (сур’езна пацярпеў падчас баеў 1915–1917 гг.), сядзіба Нямцэвічаў (15 снежня 1917 г. у ей падпісана перамір’е паміж Савецкай Расіяй і Германскай імперыяй), Нарачанскі нацыянальны парк (у 1916 г. па яго тэрыторыі праходзіла лінія фронту). Па рэках Вілія і Нарачанка праводзяцца экскурсіі на байдарках, пад час якіх прадугледжваецца наведванне памятных месцаў і аб’ектаў Першай сусветнай вайны [5, с. 246].

У наш час актыўнае развіцце набываюць лакальныя маршруты, арыентаваныя на папулярызацыю малавядомых мясцін, звязаных з Першай сусветнай вайной. Напрыклад, экскурсія “Па месцах Першай сусветнай вайны ў Івацэвіцкім раене” (г. Івацэвічы – в. Ёлкі – в. Вялікая Гаць – в. Святая Воля – в. Доўгая – г.п. Целяханы – в. Выганашчы – в. Бабровічы) знаеміць турыстаў з фрагментамі нямецкіх ліній умацаванняў і пахаваннямі салдат, загінуўшых у 1915 г. пры баях за Агінскі канал [6].

Адным з вядомых для турыстаў месцаў памяці Першай сусветнай вайны з’яўляецца г. Смаргонь, каля якога з 1915 па 1918 гг. праходзіла лінія фронту і мужна змагаліся войскі Расійскай імперыі. Вынікам стала, з аднаго боку, поўнае разбурэнне горада і цяжкія страты сярод мясцовага насельніцтва, з іншага – спыненне націску і канчатковае пазбаўленне наступальнага патэнцыялу германскай арміі. У знак пашаны перад абаронцамі Смаргонскай зямлі ў 2014 г. мясцовымі ўладамі ў Парку Перамогі пабудаваны мемарыяльны комплекс памяці герояў і ахвяр Першай сусветнай вайны, дапрацоўка і мадэрнізацыя якога працягваецца і па наш дзень [7, с. 18].

З нядаўніх часоў у Беларусі з’явілася традыцыя правядзення буйных ваенна-гістарычных фестываляў. У 2015 г. пры падтрымцы дабрачыннага фонду “Фартыфікацыя Брэста”, Івацэвіцкага райвыканкама і іншых дзяржаўных структур у Івацэвіцкім раене дэбютаваў фестываль “Выганашчанская фартэцыя”, у межах якога праводзіліся выставы салдацкай формы і зброі часоў Першай сусветнай вайны, разгортваўся ваенны лагер і рэканструяваліся баявыя дзеянні ліпеня 1915 г. У 2019 г. на пляцоўцы ваенна-гістарычнага фестываля ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту былі размешчаны інтэрактыўны лагер з выставай салдацкага абмундзіравання, цір са зброяй часоў Першай сусветнай вайны, фотазона, палявая пошта, шпіталь Чырвонага крыжа, адбылася рэканструкцыя боя 1915 г. “Свянцянскі прарыў”. Фестываль атрымаў працяг у 2021 г. пад назвай “Няскончаны ўрок: забытыя старонкі беларускай гісторыі” [5, с. 247].

Пры падтрымцы дзяржавы і прыватных фондаў набываюць папулярнасць мерапрыемствы, прысвечанныя асобным важным падзеям Першай сусветнай вайны. Напрыклад, кожны год каля сядзібы Нямцэвічаў адбываецца рэканструкцыя падпісання перамір’я паміж Савецкай Расіяй і Германскай імперыяй. У 2017 г. у г. Вілейка, дзякуючы намаганням дабрачыннага культурна-гістарычнага фонда “Крокі” і аграсядзібы “Заброддзе” ўпершыню атрымалася правесці рэканструкцыю аднайменай аперацыі верасня 1915 г. Падобныя мерапрыемствы праводзяцца і зараз:

апошняе адбылося ў кастрычніку 2022 г., у якім актыўны ўдзел прынялі ваенна-гістарычныя клубы “Рубеж” (г. Брэст), “Эпоха” (г. Мінск) і “Пяхотны 54-ы Мінскі полк” пры фінансавай падтрымцы Вілейскага райвыканкама [1].

Па стану на 2023 г. у Беларусі адсутнічае асобны дзяржаўны музей, прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны. Тым не менш, некаторыя прадметы экспануюцца ў шэрагу гістарычных і краязнаўчых музеяў краіны. Напрыклад, асобная зала адведзена ў Магілеўскім абласным краязнаўчым музеі імя Е. Р. Раманава. Менавіта ў гэтым будынку больш за стагоддзе таму назад знаходзілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Расійскай імперыі. Падзеям Нарачанскай аперацыі 1916 г. прысвечана зала ў Мядзельскім музеі народнай славы. Раскрываецца тэма Першай сусветнай вайны і ў экспазіцыі гісторыка-мемарыяльнага музея “Сядзіба Нямцэвічаў” [3, с. 41].

Унес сваю неацэнную ролю ў актуалізацыю памяці аб падзеях стогадовай даўніны і Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. У 2014 г. ім была арганізаваная выстава “Беларусь у Першай сусветнай вайне”, якая, дзякуючы міжмузейнаму супрацоўніцтву, атрымала працяг у 2015 г. у Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі. На дадзены момант, пабачыць прадметы з выставы можна ў пастаяннай экспазіцыі Нацыянальнага гістарычнага музея, прысвечанай гісторыі Беларусі ў XX ст. [7, с. 19].

Такім чынам, за час існавання Беларусі як незалежнай дзяржавы зроблена шмат для развіцця ваенна-гістарычнага турызму па месцах памяці Першай сусветнай вайны. Безумоўна, гэтага недастаткова, каб у поўнай меры адлюстраваць тое, што перажылі беларускія землі і, асабліва, іх насельніцтва, якое актыўна змагалася супраць акупацыйнага войска. Трэба працягваць планамерную працу ў дадзеным накірунку актуалізацыі культурнай спадчыны, пашыраючы колькасць і тэматычную разнастайнасць турыстычных маршрутаў, ваенна-гістарычных фестываляў і рэканструкцый, каб, у будучыні, прыйсці да стварэння асобнага музея гісторыі Першай сусветнай вайны, які прыцягне да сябе ўвагу не толькі суайчыннікаў, але і замежных турыстаў.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. В Вилейке прошла реконструкция боя Первой мировой войны [Электронный ресурс] // Новости Беларуси | БелТА. – Режим доступа: https://www.belta.by/regions/view/fotofakt-v-vilejke-proshla-rekonstruktsija-boja-per
voj-mirovoj-vojny-528198-2022/. – Дата доступа: 27.02.2023.

2. Демянчик, В. В., Рабчук, В. П. Фронт единения: туристический маршрут на Огинском канале в Ивацевичском и Пинском районах Беларуси / В. В. Демянчик, В. П. Рабчук, В. Т. Демянчик. – Брест : Альтернатива, 2015. – 18 с.

3. Морозов, Д. В., Скворчевский, Д. В. Использование национальных мест памяти в развитии военно-исторического туризма в Республике Беларусь : сборник материалов / Д. В. Морозов, Д. В. Скворчевский. – Минск : Колорград, 2022. – 343 с.

4. Под крестом святого Георгия: по следам первой мировой [Электронный ресурс] // Официальный сайт о туризме в Беларуси. – Режим доступа: https://www.belarustourism.by/ekskursovodam-i-gidam/opisanie-ekskursiy/pod-krest
om-svyatogo-georgiya-po-sledam-pervoy-mirovoy/. – Дата доступа: 27.02.2023.

5. Решетников, Д. Г. Туристско-экскурсионное использование исторического наследия Первой мировой войны в Беларуси / Д. Г. Решетников // Беларусь в современном мире : материалы XIV Междунар. конф., посвящ. 94-летию образования Белорус. гос. ун-та, Минск, 29 окт. 2015 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. – Минск : Изд. центр БГУ, 2016. – С. 245–247.

6. Туристический экскурсионный маршрут «По местам Первой мировой войны в Ивацевичском районе» Электронный ресурс] // Отдел по образованию Ивацевичского райисполкома. – Режим доступа: https://rooivacevichi.gov.by/ полезные-ссылки/туризм-и-отдых/туристический-экскурсионный-маршрут-

«по-местам-первой-мировой-войны-в-ивацевичском-районе»/. – Дата доступа: 27.02.2023.

7. Чупрасова, Д. С. Поездка на фронт: исторический туризм по следам Первой мировой войны (отечественный и европейский опыт) / Д. С. Чупрасова // История и археология : материалы VI Междунар. науч. конф., Казань, нояб. 2018 г. – Казань : Молодой ученый, 2018. – С. 18–21.

Герасимёнок В.Д., студент 350 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Лупашко И.Г.
кандидат культурологии, доцент

## КАНЦЭПЦЫЯ МУЗЕЯ-БУНКЕРА ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

У 1915 – 1916 гг. Пінскі раён стаў арэнай баявых супрацьстаянняў паміж нямецкім і рускім войскам. За час вядзення пазіцыйнай вайны з абодвух бакоў была пабудавана сотня ўмацавальных раёнаў і бункераў, выкапаны шматметровыя траншэі, а недалёка ад лініі фронту размяшчаліся артылерыйскія разлікі. Частка збудаванняў уцалела да нашых дзён. Адзін з такіх аб'ектаў размясціўся ў лесе каля в. Парэчча [1].

Больш за стагоддзе таму, недалёка ад самой вёскі, уздоўж лініі фронту, ішла чыгунка. Каля яе ў 1916 г. нямецкім кіраўніцтвам быў пабудаваны бункер, дзе размясціўся тылавы штаб камандавання, база правіянту і зброя для салдат. На дадзены момант гэта найбуйнейшы бункер часоў Першай сусветнай вайны, які знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі. У плане ен ўяўляе прастакутнік з прыбудаваным з франтальнага боку казематам. Мае два ўваходы па баках франтальнай сцяны. Унутры ўздоўж франтальнай і тылавой сцен ідуць калідоры, паміж якімі восем пакояў [5, с. 249].

Бункер, які меў вялікую ролю падчас Першай сусветнай вайны, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі фронт пайшоў яшчэ больш углыб былой